**УДК 882.6(092)Чорны**

# КАТЭГОРЫЯ РАДАСЦІ Ў АПАВЯДАННЯХ К. ЧОРНАГА

***Т.У. КІЯВІЦКАЯ***
***(Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, Мінск)***

*У прозе К. Чорнага можна вызначыць шэраг сэнсавых катэгорый (нешта новае, радасць і інш.). У дадзеным артыкуле аналізуецца катэгорыя радасці ў некаторых з апавяданняў 20-х гадоў К. Чорнага, вызначаюцца яе аспекты (радасць жыцця, радасць маладосці, радасць дзеяння, звярыная радасць, ціхая радасць і інш.), робіцца акцэнт на радасці, прычынна не абумоўленай, вызначаецца роля катэгорыі ў пабудове вобразнай сістэмы. Пісьменнік напоўніў свае творы пэўным настроем; радасць – ад сумнай і ціхай да звярынай і ненармальнай – стварае своеасаблівы псіхалагічны фон і з'яўляецца важным сродкам для стварэння вобразаў герояў. Радасць вырастае ў апавяданнях К. Чорнага да цэлай жыццёвай філасофіі, становіцца той прызмай, праз якую герой глядзіць на свет.*

**Уводзіны.** У прозе Кузьмы Чорнага можна вызначыць шэраг сэнсавых катэгорый, якія ў сваёй сістэме, выдатна характарызуюць як асобны твор, так і творчасць пісьменніка ў цэлым, утвараюць своеасаблівую семантычную матрыцу. Так, можна гаварыць пра катэгорыю «*нешта*» (або няпэўнае пачуццёвае, найперш у рамане «Сястра», а таксама ў некаторых лірычных апавяданнях, такіх як «Пачуцці», «Хвоі гавораць», «Парфір Кіяцкі» і інш.), катэгорыю «*новае*» (новыя людзі, новая краіна, новыя каштоўнасці, новая хата – новы мікракосм і г.д.) і катэгорыю «*радасць*» (якая ў сваю чаргу часта ў творах цесна звязана з вышэйназванымі катэгорыямі «нешта» і «новае»). Менавіта пра апошнюю і пойдзе гаворка далей.

**Асноўная частка.** Эмацыйны стан героя – надзвычай важны для Чорнага-псіхолага. Паглыбленне ва ўнутраны свет, душэўныя зрухі становяцца для яго адным з найбольш яркіх сродкаў стварэння мастацкага вобразу. Але радасць у прозе беларускага класіка – гэта не проста «вясёлае пачуццё, адчуванне вялікага душэўнага задавальнення» [1, с. 533]. Гэта глыбіннае ўспрыняцце, цэлая філасофія, жыццёвы погляд. Таму найперш варта гаварыць пра радасць прычынна абумоўленую і падсвядомую, невытлумачальную (не толькі для героя, але і для апавядальніка).

Для персанажаў апавяданняў Кузьмы Чорнага характэрна пачуццё дзіўнай радасці і весялосці – ад працы, ад чакання нечага новага, ад адчування жыцця. Часам гэтая радасць узнікае перад тварам вайны і смерці, таму ўспрымаецца як ненатуральная (ці нават ненармальная, антычалавечая).

Так, у апавяданні «Будзем жыць» можна вызначыць некалькі аспектаў радасці: па-першае, радасць маладосці (што звязваецца з вобразам вясёлага тэлефаніста); па-другое, радасць дзеяння (тэлефаніст рады, што нешта адбудзецца, бо «яму ўжо надаела вось ужо некалькі дзён сядзець на адным месцы» [2, с. 53]); па-трэцяе, радасць прысутнасці (гаспадыня радасна ўсміхаецца, калі бачыць «жывога чалавека, які гаварыў звычайна, не страляў, не крычаў» [2, с. 57]; жанчыне становіцца весялей ад людзей у хаце – «і ў жанчыны стала з'яўляцца радасць» [2, с. 58]); па-чацвёртае, радасць жыцця (узгадаем радасныя ўсмешкі раненага салдата, весялосць раненага тэлефаніста, «радаснае жаданне жыць» [2, с. 61] у бацькі тэлефаніста); па-пятае, радасць вяртання да звыклага парадку (гаспадыні «было радасна ад таго, што яна зноў пачне так, як і раней, насіць з калодзезя вёдрамі ваду, даіць карову, працаваць светлымі летнімі днямі ў грамадзе» [2, с. 59]).

Малады тэлефаніст і на свайго камандзіра глядзіць весела, бо менавіта гэты чалавек прамаўляе да юнака, што, пэўна, трэба біць, а значыць, хутка марудны, сумны спакой зменіцца на дзейнасць і ўжо не трэба будзе мёрзнуць, седзячы доўгі час на адным месцы без цёплай вопраткі. Радуецца хлопец яшчэ і таму, што, як яму думаецца, баталіі набліжаюць канец вайны, а вось цішыня і спакой толькі адцягваюць яго. У ад'ютанта камандзіра палка іншая прычына для радасці: нарэшце яны будуць наступаць, а не адступаць – так цяжка аддаваць крок за крокам родную зямлю.

Гаспадыня хутара, яшчэ маладая кабета, пакуль паблізу стралялі, баязліва прасядзела ў сырым склепе адна, бо сам гаспадар хаваўся ў лесе з конямі. Калі яна выходзіць, то шукае сабе хоць якую-небудзь працу, каб супакоіцца. І вось прыходзіць да яе «жывы чалавек» без намеру забіваць і руйнаваць, таму ад радасці яна гатова аддаць яму «не толькі салому, але і ўвесь хутар» [2, с. 57]. Яна нават не думае, чаму гэтыя людзі з'явіліся на хутары і што робіцца вакол. Гэта, можна сказаць, псіхалагічны шок; радасць засціць гаспадыні свет, і каб сказалі ёй запаліць уласную хату, «яна, мабыць, не доўга думаючы, гэта зрабіла б» [2, с. 57].

Такім чынам, дадзены твор канцэнтруе ў сабе розныя грані катэгорыі радасці, якія паасобку выяўляюцца ў розных апавяданнях (і наогул, у прозе К. Чорнага). Але менавіта «Будзем жыць» дапамагае нам стварыць пэўную класіфікацыю, да якой ніжэй, прааналізаваўшы некалькі твораў, мы дададзім яшчэ шэраг аспектаў. Заўважым, што вызначаныя намі аспекты выяўляюцца і ў буйных творах пісьменніка. Калі прымяніць дадзеную класіфікацыю, напрыклад, да больш позняга твора, рамана «Пошукі будучыні», то ўжо ў першай частцы можам вылучыць такія аспекты катэгорыіі, як радасць прысутнасці («Вострая радасць агарнула Волечку: яна не адна...» [3, с. 15] – адчувае гераіня, калі ў хаце з'яўляецца Кастусь

Лукашэвіч і пачынае дапамагаць ёй) і радасць жыцця. Пра апошнюю мы гаворым адносна палоннага немца Густава Шрэдэра, які адчувае, што выжыў. Гэтае яго пачуццё пераходзіць і на іншых удзельнікаў сітуацыі: «Твар яго свяціўся радасцю. Пячаць вялікай праўды ляжала на яго вачах: ён – уладар свету, бо ўжо зноў ходзіць па зямлі і трохдзённае змрочнае ўтрапенне яго мінулася навек. <...> Здавалася, праменне ідзе ад яго ўсмешкі. Усміхаўся шчасцем і салдат, і фельчар, і нават Кастусь, толькі Волечка стаяла чамусьці маўклівая. Гэта была сцэна як бы бурнай чалавечай радасці» [3, с. 22]; «У яго радасць жыцця стаптала пад ногі смутак смерці» [3, с. 36].

Але вернемся да малой прозы. Адносна згаданага намі апавядання («Будзем жыць») крытык М. Тычына заўважае: «Пісьменнік паказвае ў адным творы некалькі малюнкаў людской радасці і “высякае” іскру вялікай аптымістычнай думкі, якая выказваецца ў словах, вынесеных у заагаловак, “будзем жыць”!» [4, с. 16].

Радасцю поўніцца і герой іншага твора, апавядання «На беразе», Амелька. Дзякую весялосць выяўляюць тут і камсамольцы, што прыходзяць на бераг; яны смяюцца, крычаць і спяваюць. Амелька ж характарызуецца як чалавек з «вясёлым гумарам». Запал маладых перадаецца, у рэшце рэшт, і яму, яго таксама ахоплівае буйная весялосць. І вось ужо радасць Амелькі пераносіцца на ўвесь свет, герой «ахоплены нейкаю вольнаю сілай – на зямлі так шумна і весела» [2, с. 68]. Такім чынам, радасць яго інакшая, чым вясёлых камсамольцаў. Яна шырэйшая і больш глыбокая.

У апавяданні выразна вызначаюцца два аспекты: 1) радасць асобы; 2) радасць новых людзей («новыя камуністы..., заўсёды вясёлыя, знайшлі, мусіць, дарогу к гэтай радасці» [2, с. 69]).

Радасць адчуваецца і пры сустрэчы Амелькі з аратым («чулася нейкая радасць чалавека, які бачыць сонца і светлую ад яго зямлю» [2, с. 71]).

Падкрэслім асабліва, што ва ўсіх гэтых выпадках радасць герояў прычынна не абумоўлена, гэта хутчэй падсвядомае пачуццё. Ці, як у выпадку з «новымі людзьмі», крыніца гэтай радасці невядома галоўнаму герою, роўна як і чытачу (калі звярнуцца да зробленай намі класіфікацыі, то прычынна абумоўленай будзе з’яўляцца ва ўсіх выпадках, напрыклад, радасць прысутнасці).

У апавяданні «Дзень» нават сцены маюць «нейкі вясёлы выгляд» [2, с. 76]. Настаўнік, прачнуўшыся і слухаючы гукі раніцы, адчувае, што «ўсё тое, што кругом напаўняе жыццё, ёсць нешта слаўнае, добрае; загэтым і дае яно радасць самому жыццю» [2, с. 76]. Зноў жа, першапрычына радасці схавана ў самой крыніцы жыцця. Гэта радасць усеабдымная, гэта ўспрыняцце, а не канкрэтна скіраванае пачуццё: «Вучыцель навучыўся знаходзіць радасць жыцця ў працы, у людзях, у кожным кавалку зямлі, ва ўсякай з’яве», – тлумачыць аўтар [2, с. 77]; «Радасці было многа. Яна была і ў працы, і ў дзецях, і ў людзях, і ў полі вакол... І радасць гэтая была для яго праўдзіваю, не часоваю, як раней ён думаў аб усякай радасці, а такою, якая выйшла з тае самае жыццёвае крыніцы, з якое і павінна выходзіць усякая радасць жыцця [2, с. 77].

Такім чынам, пачуццё гэтае вырастае да цэлай жыццёвай філасофіі, становіцца той прызмай, «каляровым шкельцам», праз якое герой глядзіць на свет і бачыць у кожнай праяве жыцця ўжо нешта канкрэтнарадаснае. І таму настаўнік, ідучы з мужыкамі ў вёску, адчувае разам з усімі «радаснае пачуццё агульнай блізасці між сабою» [2, с. 86].

Асобнае месца займае ў гэтай сістэме апавяданне «Жалезны крык». У творы радасным звонам абзываецца дрот, радасна пазірае і гаворыць качагар, смяецца дарога, спяваюць калёсы «радасную песню вялікага імкнення» [2, с. 95], чуецца радасная, зычная мелодыя, радасным захапленнем свецяцца твары людзей ад «нябачаных, вялікіх машын-плугоў» [2, с. 96]. Гэта своеасаблівы фон, абстрактная радасць. Адносна радасці чалавека ў творы мы знаходзім два меркаванні, а па сутнасці, дзве філасофскія пазіцыі.

Так, качагар тлумачыць радасць па-свойму: «Дзень прыйшоў, і людзі рады» [2, с. 97]. Яго пасажыр – носьбіт іншай філасофіі: «Радасць на зямлі ў іншым; для мяне яна ў цішыні. Чалавек павінен быць ціхім і пакорным, калі хоча быць радасным ціхаю радасцю» [2, с. 97].

Людзі, якія не прымаюць гэтай ціхай радасці, і насамрэч валодаюць «жалезнаю душою», пра якую згадвае К. Чорны. Адцягнуўшы самагубцу ад цягніка, яны спяшаюцца паглядзець на новыя машыны: смерць чалавека не перашкаджае ім радавацца. Гэтая весялосць антыгуманная, бо бездухоўная. Машыны ставяцца вышэй за натуральнае і за самога чалавека, і ў знікненні натуральнага бачыцца радасць.

Пра ціхую радасць гаворыцца і ў апавяданні «Вечар». Ціхая радасць – гэта атрыбут і вечара, і восені, калі становіцца «менш звінючай вясёласці» [2, с. 299]. У апавяданні выразна вымалёўваецца «мяжа радасці і смутку»: яе адчувае адзін з жыльцоў шматкватэрнага дома, Віктар Зеніч (пра гармонію смутку і радасці ў творах Чорнага будзе сказана асобна).

У апавяданні «Андрэй Клыга» Мар’я спазнае «нейкую радасць, якую яна нават не разумела, а толькі адчувала ў сабе» [2, с. 106].

У «Ночы пры дарозе» радасць пільшчыку Уласу прыносіць праца ў глушы восенню. Гэтая радасць якраз прычынна абумоўленая: у гэты час і вёскі сытыя, і піла звініць звонка. Зусім іншая радасць ахоплівае пільшчыкаў, калі яны збягаюць з хаты рыжага, дзе засталася цяжка хворая жанчына. Бо яны збеглі ад бяды, «усё тое» засталося ў хаце: «І нейкая буйная радасць саўсім ахваціла іх. <...> І захацелася ім абодвум тады крычаць моцна або спяваць» [2, с. 131]. Гэтае пачуццё – ненармальнае, своеасаблівы псіхалагічны

шок перад тварам смерці. Дзікая радасць ахоплівае і гаспадара хаты. Ён не ўсведамляе, што робіцца навокал, не разумее сутнасць сваіх учынкаў. Гэта яго рэакцыя на збаўленне ад чужой смерці ў сваёй хаце.

У апавяданні «Радасць жанчыны» К. Чорны паказвае нараджэнне новай надзеі на нешта светлае і добрае ў сялянкі Ганны. Для гэтага ствараецца кантрастны фон: асеннія дажджы, панурыя хаты, незадавальненне, смутак, цяжкая праца, сярдзіты брат, калатня, «нуда цёмнага жыцця», «слёзы», убогасць, адзінота. І вось Ганна слухае незнаёмую гарадскую жанчыну, і нараджаецца ў яе сэрцы «нешта вялікае і радаснае» [2, с. 220].

Радасцю жыве і герой апавядання «Бяздонне», Алёша. Гэтая радасць – ад маладосці і самога жыцця («І тая ж самая радасць ужо калоціцца ў ім самім. Яна вялікая, як імкненне маладосці» [2, с. 224]). Нават Стронін, студэнт трэцяга курса, сын багатых мяшчан, адчувае гэтую радасную акрыленасць Алёшы, але на пытанне аб прычыне «заўсёднай нейкай весялосці», апошні адказаць не можа, бо такі стан звычайны для яго, а не выкліканы канкрэтнай падзеяй ці пачуццём.

У апавяданні «Па дарозе» зямля параўноўваецца з чалавечай радасцю: яна такая ж «шырокая, бяскрайняя, здольная будзіць вялікія імкненні пачуццяў і думак» [2, с. 250]. «На зямлі ж дарога, як само жыццё», а па роднай зямлі «можна ісці з радасцю ў бяскрайніх прасторах» [2, с. 250]. Толькі Паўлу Грыбку не так і радасна ехаць з усімі па цёмнай дарозе. Яго ахоплівае вялікая нуда з-за Насці, з-за сваёй хваробы і пустой хаты. Павел адчувае звярыную радасць Аляксея Мельгуна: «Гэта была радасць звера, радасць жывёлы, без думак, без жаданняў, тупая і нікчэмная» [2, с. 254].

У гарадскім садзе Павал слухае музыку, «вясёлыя зыкі» – і нараджаецца ў яго лёгкасць, «радасна ахапіла імкненне» [2, с. 260]. Гэта радасць не перавагі моцнага над слабым (як у Мельгуна), не надзеі на новае (як у Ганны з «Радасці жанчыны»), гэта настраёвасць, падораная музыкай.

Такім чынам, да згаданых напачатку аспектаў катэгорыі радасці можна дадаць наступныя: радасць як усеагульная катэгорыя безадносна асобы; звярыная радасць (радасць перавагі моцнага над слабым); радасць як псіхалагічны шок; ціхая радасць.

Адчуванне радасці перадаецца не толькі чалавеку. К. Чорны надзяляе ім і каня Буланага ў аднайменным апавяданні. Калі гаспадар выпрагае яго і пускае на межы, у Буланага з’яўляецца «ў першы момант якраз тое, што людзі ў сабе называюць уздымам радасці» [2, с. 320]. Менавіта ў гэтым апавяданні пісьменнік прыроўнівае радасць да сэнсу жыцця: «…жыццё – бязмернае і неабдымнае, і перад адчуваннем яго нішто абшары свету, і сэнс яго – у радасці; адчуваючы смутак, істота адчувае і не забывае, што існуе радасць і што ў ёй і ў вечным імкненні да яе – апраўданне жыцця» [2, с. 328].

Заўважым, што смутак і радасць ідуць разам і ў іншых творах Кузьмы Чорнага. Так, у «Парфіры Кіяцкім» адчуваецца сумная радасць, калі нават смерць і хвароба затым і з’яўляюцца на жыццёвым шляху, «каб сваёю цеменню навучыць і сляпога бачыць і цаніць ясноты радасці…» [2, с. 342].

У апавяданні ж «Хвоі гавораць» паўтараецца думка з «Буланага», што смутак патрэбны якраз для таго, каб адчуць радаснае ў жыцці. Герой-апавядальнік разважае наступным чынам: «...Калі шукаць ці ствараць апраўданні ўсяму, то смутак, напрыклад, можа мець апраўданне, што для таго ён, каб пасля яго больш аценіць радасць» [2, с. 420]. Такім чынам, дададзім яшчэ адзін аспект – сумная радасць.

**Высновы.** У апавяданнях мы вызначылі некалькі аспектаў радасці: радасць маладосці; радасць дзеяння; радасць прысутнасці; радасць жыцця; радасць вяртання да звыклага парадку; радасць як усеагульная катэгорыя безадносна асобы; звярыная радасць (радасць перавагі моцнага над слабым); радасць як псіхалагічны шок; ціхая радасць; радасць новых людзей; сумная радасць. Зазначым, што мы прааналізавалі толькі некаторыя з ранніх апавяданняў К. Чорнага, закранулі толькі два эпізоды з «Пошукаў будучыні», таму азначэнне катэгорыі радасці ў дадзеным выпадку не можа быць поўным. Але, як бачым, нават на гэтым матэрыяле выяўляецца багата аспектаў. Пісьменнік напоўніў свае творы пэўным настроем, радасць – ад сумнай і ціхай да звярынай і ненармальнай – стварае своеасаблівы псіхалагічны фон і з’яўляецца важным сродкам для стварэння вобразаў герояў. Вызначаючы аспекты радасці, характэрныя для пэўнага персанажа, чытач выяўляе яго характар, яго ад-носіны да людзей, зямлі, свету. Радасць як сэнсавая катэгорыя займае значнае месца не толькі ў ранніх апавяданнях пісьменніка, але і ва ўсёй яго празаічнай спадчыне.

ЛІТАРАТУРА

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – Мінск: БелЭн, 1996. – 784 с.
2. Чорны, К. Збор твораў у васьмі тамах / К. Чорны // Апавяданні 1923 – 1927. – Мінск: Мастацкая літ., 1972. – Т. 1. – 554 с.
3. Чорны, К. Збор твораў: у 8-мі т. / К. Чорны. – Мінск: Мастацкая літ., 1974. – Т. 6. – 520 с.
4. Тычына, М.А. Кузьма Чорны: Эвалюцыя мастацкага мыслення / М.А. Тычына. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 168 с.

*Паступіў 20.11.2007*